*УДК 94(476)«17/19»+ 16.342.4–058.13:34(476)(091)«17/19»*

*К. С. ЦЕРАШКОВА*

# АСАБЛІВАСЦІ ПРАВАВОГА СТАТУСУ МЯШЧАН БЕЛАРУСІ (канец XVIII – пачатак XX ст.)

На основе изучения источников законодательства конца XVIII – начала XX в. анализируются особенности правового статуса мещан белорусско-литовских губерний. Рассматриваются основные права и обязанности мещан, особое внимание при этом уделено изменению правового статуса мещан во второй половине XIX – начале XX в. Подчеркивается, что трансформация правового статуса мещан белорусско-литовских губерний, с одной стороны, отражала общие тенденции развития общества Российской империи, а с другой – отмечалась региональной спецификой. Несмотря на то что основной характеристикой социального статуса личности в обозначенный период является сословная принадлежность, правовой статус мещан белорусско-литовских губерний в значительной степени был детерминирован этноконфессиональной принадлежностью. Делается вывод о том, что характерные особенности правового статуса мещан, связанные со спецификой правительственной политики и этноконфессиональной структуры мещан, а также другими аспектами, по существу обусловили функционирование в рамках этой категории населения социальных групп, которые отличались по своим правам и обязанностям.

***Ключевые слова:*** законодательство; правовой статус; социальный статус; мещане; сословная структура; этноконфессиональная структура; модернизация общества; социальная стратификация; основные права и обязанности; реформирование законодательства.

Based on the study of the law of the late XVIII – early XX century the characteristics of the legal status of the «meschanie» in Belarusian-Lithuanian provinces are analysed. The basic rights and duties of the middle class are considered, special attention being paid

to the «meschanie» status change in the late XIX – early XX century. The author emphasizes that, on the one hand, the transformation of the legal status of the «meschanie» in Belarusian-Lithuanian provinces reflects the general trend of social development in the Russian Empire and, on the other hand, it marked the regional specificity. Despite the fact that the main characteristic of the social status of an individual in that period is class affiliation, the legal status of the «meschanie» in Belarusian-Lithuanian provinces was largely determined by ethnic and religious affiliation. It is concluded that the characteristic features of the legal status of the «meschanie», related to specific government policies and ethnic and religious structure of the «meschanie» as well as other aspects essentially determined the functioning of social groups, which differed according to their rights and duties, within this population category.

***Key words:*** legislation; legal status; social status; «meschanie»; estate structure; ethnic and religious structure; society modernization; social stratification; basic rights and obligations; legislative reforming.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адным з асноўных кірункаў урадавай палітыкі з'яўлялася праблема ўніфікацыі заканадаўства «губерний, от Польши возвращенных», з унутранымі губернямі і фарміравання адзінай прававой прасторы. Перыяд з канца XVIII ст. да пачатку 30-х гг. XIX ст. характарызаваўся паступовым нівеліраваннем рэгіянальных асаблівасцей Заходніх губерняў. Пераход да поўнай уніфікацыі, выкліканы падзеямі паўстання 1830–1831 гг., супаў з працэсамі кадыфікацыі права ў Расійскай імперыі ў 30-я гг. XIX ст. і выхадам IX тома «Свода законов Российской империи» («О состояниях»). Пры гэтым змены ва ўрадавым курсе абумовілі выданне адзінага агульнага для ўсіх губерняў Расійскай імперыі зводу законаў замест запланаванага асобнага для Заходніх губерняў[1]. Ужо з 1 студзеня 1831 г. скасоўвалася дзеянне Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. у Магілёўскай і Віцебскай губернях, а ў адпаведнасці з законам «О распространении силы и действия Российских гражданских законов на все Западные возвращенные от Польши области» ад 25 чэрвеня 1840 г. – у Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губернях[2].

Разам з тым, нягледзячы на працэсы ўніфікацыі заканадаўства, прававы статус розных сацыяльных катэгорый беларуска-літоўскіх губерняў характарызаваўся сваімі асаблівасцямі ў параўнанні з іншымі губернямі Расійскай імперыі. Для дадзеных губерняў былі ўласцівы склаўшаяся прававая культура і традыцыя, на ўніфікацыю якіх была накіравана ўрадавая палітыка, а таксама спецыфічныя рэгіянальныя ўмовы, што адрозніваліся ад агульнарасійскіх і выклікалі неабходнасць прыняцця адпаведных нарматыўна-прававых актаў у адносінах да акрэсленых тэрыторый.

Асноўнымі гістарычнымі крыніцамі пры даследаванні асаблівасцей прававога статусу мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў выступаюць уласна заканадаўчыя крыніцы канца XVIII − пачатку XX ст., якія даюць магчымасць прааналізаваць працэс фарміравання мяшчан як асобнай групы ў межах саслоўя гарадскіх абывацеляў і трансфармацыю яе прававога статусу, урадавую палітыку ў адносінах да гэтай катэгорыі насельніцтва. Сярод публікацый дакументаў заканадаўства асобае месца займаюць «Полное собрание законов Российской империи» і «Свод законов Российской империи», акрамя таго, значную цікавасць прадстаўляюць выданні «Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 г.», «Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев»[3].

У адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. прававы статус мяшчан як складаючай часткі саслоўя гарадскіх абывацеляў характарызаваўся дэталёва вызначаным комплексам правоў і абавязкаў. Мяшчане беларуска-літоўскіх губерняў валодалі значнымі правамі, да якіх адносіліся права вядзення гандлёва-прамысловай дзейнасці, уладання нерухомай маёмасцю і ненаселенымі землямі, саслоўнага самакіравання і гарадскога кіравання, права аховы асобы і маёмасці законам, медыцынскай дапамогі і інш. На працягу акрэсленага перыяду мяшчане выконвалі як грашовыя, так і натуральныя павіннасці, функцыю раскладкі і адказнасць за выплату якіх несла мяшчанскае грамадства. Такім чынам, прававы статус мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў уяўляў сабой сукупнасць правоў і абавязкаў, якія, па сутнасці, абумоўлівалі іх прыналежнасць да адпаведнай сацыяльнай катэгорыі, і адпавядаў прававому статусу мяшчан унутраных губерняў Расійскай імперыі ў тых выпадках, калі іншае не прадугледжвалася па заканадаўстве.

Прававы статус мяшчан Расійскай імперыі і яго рэгіянальныя асаблівасці, рэгламентаваныя раздз. III «О городских обывателях» IX тома «Свода законов Российской империи», вызначаліся ў тым ліку існаваннем асобнага заканадаўства ў адносінах да іншародцаў (у прыватнасці, да яўрэяў) – раздз. VI «О состоянии инородцев» IX тома «Свода законов Российской империи», што мела прынцыповае значэнне для мяшчан-іўдзеяў беларуска-літоўскіх губерняў, а таксама спецыяльнымі нарматыўна-прававымі актамі ў межах ажыццяўлення ўрадавай палітыкі. У сувязі з названымі абставінамі рэгуляванне правоў і абавязкаў, а таксама прававых адносін мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў насіла больш складаны і неадназначны характар, чым ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі.

Урадавая палітыка Расійскай імперыі аказала прынцыповы ўплыў на працэсы фарміравання структуры насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў. Пры вызначэнні асноўных катэгорый насельніцтва, якія адносіліся да саслоўя гарадскіх абывацеляў у цэлым, акрамя такіх саслоўных груп, як ганаровыя грамадзяне, купцы, мяшчане, цэхавыя, рабочыя, на тэрыторыі Заходніх губерняў у склад саслоўя былі аднесены таксама грамадзяне гарадоў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Падольскай, Валынскай, Кіеўскай, Ковенскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў, што паходзілі з незацверджанай Герольдыяй шляхты, а таксама вольныя людзі асобных гарадоў Віленскай, Гродзенскай, Падольскай, Валынскай, Кіеўскай, Ковенскай і Прыбалтыйскіх губерняў[4]. Неабходна падкрэсліць, што ў выніку ўпарадкавання

саслоўнай структуры і скасавання асобнага статусу грамадзян і вольных людзей Заходніх губерняў дадзеныя сацыяльныя катэгорыі былі ўключаны непасрэдна ў склад мяшчан[5].

Да асноўных крыніц папаўнення саслоўнай групы мяшчан па заканадаўстве Расійскай імперыі адносіліся сельскія абывацелі ўсіх найменняў, дзеці асабістых дваран, якія не мелі афіцэрскіх чыноў, іншародцы, а таксама асобы, якія мелі права ці абавязак абіраць род жыцця, да якіх адносіліся дастаткова шырокія катэгорыі насельніцтва[6]. Пры гэтым увядзенне мяжы яўрэйскай аседласці ў канцы XVIII ст. і яе далейшая прававая рэгламентацыя прывялі да значнай канцэнтрацыі яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках, што фактычна вызначыла крыніцы папаўнення мяшчан, іх сацыяльны і этнаканфесійны склад. Такім чынам, пры функцыянаванні агульных для мяшчан Расійскай імперыі каналаў узнікнення мяшчанскага статусу (нараджэнне, усынаўленне, шлюб ці набыццё статусу) урадавая палітыка ў адносінах да Заходніх губерняў абумовіла дастаткова неаднародны сацыяльны склад гэтай саслоўнай групы[7].

Згодна з заканадаўствам Расійскай імперыі мяшчане складаліся з мяшчанскага грамадства, удзельнікі якога былі звязаны паміж сабой узаемнай адказнасцю за выплату падаткаў і выкананне натуральных павіннасцей. Важнай складаючай прававога статусу мяшчан з’яўлялася магчымасць фарміравання асобных грамадстваў для хрысціян і іўдзеяў[8]. Пры гэтым адметнае становішча яўрэйскіх грамадстваў характарызавалася наяўнасцю інстытута кагалаў, якія адыгрывалі ключавую ролю ў функцыянаванні дадзеных грамадстваў і, па сутнасці, надавалі мяшчанам-яўрэям статус асобнай сацыяльнай катэгорыі як у межах саслоўнай групы мяшчан, так і саслоўя гарадскіх абывацеляў у цэлым[9]. У сувязі з імкненнем да большай інтэграцыі і ўпарадкавання саслоўяў і саслоўных груп, а таксама ліквідацыі спецыфічных рыс унутранай арганізацыі яўрэйскага насельніцтва 19 снежня 1844 г. было прынята «Положение о подчинении Евреев в городах и уездах общему управлению, с уничтожением Еврейских кагалов»[10]. Разам з тым асаблівасці этнаканфесійнага складу і існаванне асобных ад хрысціянскіх яўрэйскіх грамадстваў захоўвалі ўнутраны падзел у межах саслоўнай групы мяшчан.

Адметнай рысай саслоўнага самакіравання мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў з’яўлялася таксама наяўнасць пасады мяшчанскіх дэпутатаў для вынясення грамадскіх прысудаў у гарадах Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губерняў[11]. Такім чынам, саслоўнае самакіраванне мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў, з аднаго боку, адрознівалася ад агульнарасійскіх нормаў, а з другога – мела свае асаблівасці непасрэдна ў межах названых губерняў.

Пры фарміраванні прававых асноў сацыяльнай стратыфікацыі гарадскога насельніцтва і размежаванні суб’ектаў сацыяльнай структуры Расійскай імперыі заканадаўчымі актамі канца XVIII ст. было замацавана выключнае права мяшчан на гандлёва-прамысловую дзейнасць[12]. У сувязі з тым што правы і абавязкі мяшчан, абумоўленыя іх гаспадарчымі заняткамі, па сутнасці, выступалі паказчыкам прыналежнаці да саслоўнай групы мяшчан, значная ўвага з боку дзяржавы надавалася рэгламентацыі гандлёва-прамысловага заканадаўства. У цэлым правамоцтвы мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў адносна такіх традыцыйных гаспадарчых заняткаў, як гандлёвая і прамысловая дзейнасць, адпавядалі агульнарасійскім нормам пры некаторых асаблівасцях заканадаўства ў адносінах да мяшчан-яўрэяў[13].

У акрэслены перыяд мяшчане беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі карысталіся правамі ўладання і набыцця нерухомай маёмасці ў гарадах і мястэчках, а таксама ненаселеных земляў. Важную ролю ў эвалюцыі характару землеўладання адыграў загад «О предоставлении купечеству, мещанству и казенным поселянам приобретать покупкою земли» ад 12 снежня 1801 г., які пашырыў кола суб’ектаў права зямельнай уласнасці, вызначыў аб’ект права зямельнай уласнасці і адносіўся да ўладанняў па-за межамі гарадоў[14]. Пры гэтым абмежаванні ў распараджэнні нерухомай маёмасцю ў гарадах і мястэчках былі дэтэрмінаваны казённым правам уласнасці на зямлі, на якіх былі ўзведзены жылыя і гаспадарчыя пабудовы мяшчан[15]. Права карыстання землямі належала гарадскому грамадству і ажыццяўлялася гарадскімі ўладамі, якія, у сваю чаргу, здавалі зямельныя надзелы ў арэнднае карыстанне на аснове правілаў, вызначаных «Уставом о городском хозяйстве»[16].

У сувязі з тым што зямельная ўласнасць і зямельныя адносіны з’яўляліся асновай традыцыйнага грамадства, якая вызначала сацыяльную структуру і ўнутраную палітыку Расійскай імперыі, значная ўвага надавалася рэгуляванню кола суб’ектаў права зямельнай уласнасці, пры гэтым урадавая палітыка была накіравана на абмежаванне маёмасных правоў няправаслаўных мяшчан.

Значныя абмежаванні ў землеўладанні і землекарыстанні адносіліся да мяшчан-каталікоў Заходніх губерняў у сувязі з загадам «О недопущении лиц польского происхождения к содержанию казенных оброчных статей Западного края» ад 27 жніўня 1885 г.[17] Некаторыя паслабленні ў заканадаўстве звязаны з выхадам 20 лістапада 1887 г. загада «Об условиях допущения лиц бывшей польской шляхты и мещан-католиков к арендованию казенных оброчных статей в Западных губерниях», дазволіўшага мяшчанам-каталікам, прыпісаным у склад сялян пасля 27 жніўня 1885 г., арандаванне казённых зямельных надзелаў пры ўмове, што дадзеныя мяшчане займаюцца земляробствам[18]. Акрамя таго, права набываць зямлю з дапамогай Сялянскага пазямельнага банка загадам ад 5 снежня 1888 г. было распаўсюджана толькі на мяшчан-праваслаўных і старавераў Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў[19].

Складаны характар насіла рэгуляванне маёмасных правоў мяшчан-яўрэяў беларуска-літоўскіх губерняў. Прававымі актамі першай паловы XIX ст. яўрэям у мяжы аседласці рэгламентавалася пра-

ва набыцця нерухомай маёмасці рознага характару за выключэннем дзевяці Заходніх губерняў, у якіх яўрэі пазбаўляліся права набыцця ці прыняцця ў залог памешчыцкіх, сялянскіх ці казённых зямельных надзелаў[20]. Яўрэям давалася магчымасць выступаць у якасці арандатараў ці ўпраўляючых заводаў пры маёнтках, што не распаўсюджвалася, аднак, на маёнткі цалкам і зямельныя надзелы. У апошняй чвэрці XX ст. адбываецца далейшае абмежаванне правоў дадзенай сацыяльнай катэгорыі, звязанае ў тым ліку з выхадам пастановы ад 3 мая 1882 г. аб прыпыненні правоў яўрэяў на набыццё ці ажыццяўленне закладных і арэндных актаў на нерухомую маёмасць па-за гарадамі і мястэчкамі ў мяжы яўрэйскай аседласці[21].

Па заканадаўстве канца XVIII − пачатку XX ст. права міграцыі са сталага месца жыхарства насельніцтва Расійскай імперыі было абмежавана неабходнасцю атрымання адпаведнага віду на перамяшчэнне ці пашпарта. Пры гэтым у адрозненне ад агульнарасійскіх нормаў, згодна з якімі сталым месцам жыхарства мяшчан лічыліся гарады, у якіх мяшчане былі запісаны ў абывацельскія кнігі, у адносінах да Заходніх губерняў прызнаваліся таксама прыватнаўласніцкія землі ці мястэчкі, дзе мяшчане пражывалі цэлымі грамадствамі, асобнымі ад гарадскіх[22]. Дадзеная асаблівасць звязана са значнай канцэнтрацыяй мяшчан у мястэчках, якія займалі своеасаблівае месца ў структуры паселішчаў названых губерняў, а таксама ў сельскай мясцовасці. Пры гэтым правамоцтвы выбару месца жыхарства і міграцыі мяшчан-яўрэяў, як ужо было адзначана вышэй, былі дэтэрмінаваны існаваннем мяжы яўрэйскай аседласці. Нягледзячы на тое што праблема адмены мяжы яўрэйскай аседласці з'яўлялася вострым пытаннем унутранай палітыкі Расійскай імперыі, яна атрымала канчатковае вырашэнне толькі 20 сакавіка (2 красавіка) 1917 г. у сувязі з пастановай Часовага ўрада «Об отмене вероисповедных и национальных ограничений»[23].

У адрозненне ад мяшчан іншых губерняў Расійскай імперыі, якім на працягу вывучаемага перыяду як падатковай катэгорыі насельніцтва быў закрыты доступ да дзяржаўнай службы, у адносінах да мяшчан Заходніх губерняў дадзенае абмежаванне было скасавана. Неабходна падкрэсліць, што магчымасць паступлення на дзяржаўную службу атрымалі ў асноўным мяшчане-хрысціяне, пры гэтым быў закрыты доступ да дзяржаўнай службы мяшчан-яўрэяў, акрамя некаторых асобных выключэнняў[24]. Такім чынам, нягледзячы на агульныя тэндэнцыі нівеліравання саслоўнага фактару ў канцы XIX − пачатку XX ст. у Расійскай імперыі і прадстаўлення доступу да асобных дзяржаўных пасад падатковым катэгорыям насельніцтва ў 1906 г., магчымасці рэалізацыі асобы ў дачыненні да дзяржаўнай службы па-ранейшаму вызначаліся яе саслоўнай прыналежнасцю[25]. Разам з тым у Заходніх губернях у сувязі з недаверам ўрада да мясцовага дваранства правамоцтвы мяшчан пры паступленні на дзяржаўную службу вызначаліся пераважна этнаканфесійнай прыналежнасцю.

Правамоцтвы мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў у публічным праве Расійскай імперыі абумоўлены ў тым ліку правамі ўдзелу ў гарадскім кіраванні і мяшчанскім самакіраванні. Рэарганізацыя гарадскога кіравання ў апошняй чвэрці XIX ст. у адпаведнасці з Гарадавым палажэннем 16 чэрвеня 1870 г., уведзеным у гарадах Заходніх губерняў законам ад 29 красавіка 1875 г., а затым Гарадавым палажэннем 11 чэрвеня 1892 г., заклала ў аснову выбарчай сістэмы маёмасны цэнз на прынцыпе выплаты падаткаў. Рэалізацыя выбарчых правоў мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў, акрамя вызначанага агульнарасійскім заканадаўствам маёмаснага цэнзу, звязана са значнымі абмежаваннямі доступу да гарадскога кіравання мяшчан-яўрэяў, а таксама ўзмацненнем адміністрацыйнага кантролю за дзейнасцю органаў гарадскога кіравання. Неабходна падкрэсліць, што з увядзеннем у гарадах Заходніх губерняў Гарадавых палажэнняў 1870 і 1892 гг. звязана трансфармацыя саслоўнага самакіравання, у выніку чаго ў дадзеных губернях склаліся дзве розныя сістэмы арганізацыі кіравання ў межах саслоўнай групы мяшчан[26].

Адным з асноўных складнікаў прававога статусу мяшчан Расійскай імперыі з'яўляўся абавязак выплачваць падаткі. Мяшчане беларуска-літоўскіх губерняў выконвалі агульныя для мяшчан Расійскай імперыі грашовыя і натуральныя павіннасці, функцыю раскладкі і адказнасць за выплату якіх, як ужо было адзначана, несла мяшчанскае грамадства. У абавязак мяшчан да 1860-х гг. уваходзіла выплата як падушнага падатку, так і падаткаў на ўладкаванне шляхоў зносін, звыш таго, мяшчане выплачвалі розныя зборы на грамадскія і казённыя патрэбы. У адносінах да мяшчан-яўрэяў уводзілася ажыццяўленне дадатковых збораў, у тым ліку каробачнага збору[27].

Рэфармаванне падатковага заканадаўства ў другой палове XIX ст., звязанае з увядзеннем такіх падаткаў, як падатак з нерухомай маёмасці, падаткаў на права гандлю і промыслаў, падаткаў з грашовых капіталаў, дзяржаўнага кватэрнага падатку, абумовіла прынцыповая рэарганізацыя ўсёй падатковай сістэмы Расійскай імперыі, што аказала значны ўплыў на трансфармацыю прававога статусу мяшчан[28]. У адпаведнасці з законам 1898 г. аб прамысловых падатках, усталяваўшым кампраміс паміж саслоўным і бессаслоўным прынцыпамі падаткаабкладання, памеры выплаты залежалі не ад саслоўнай прыналежнасці ўладальніка, а ад непасрэднага прыбытку прадпрыемства[29]. Важнае значэнне мела правядзенне вайсковых рэформ і ўвядзенне 1 студзеня 1874 г. усеагульнай воінскай павіннасці[30]. Такім чынам, ліберальныя рэформы 1860–70-х гг., а таксама рэфармаванне сферы падаткаабкладання, у аснове якога ў канцы XIX ст. быў закладзены маёмасны цэнз, ва ўмовах мадэрнізацыйных працэсаў і пераходу да грамадства іншага тыпу садзейнічалі нівеліраванню фактару саслоўнай прыналежнасці асобы.

Трансфармацыя прававога статусу мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў у канцы XVIII – пачатку XX ст., што закрануў правамоцтвы і абавязкі дадзенай катэгорыі насельніцтва, вызначаныя як прыватным, так і публічным правам, з аднаго боку, адлюстроўвала агульныя тэндэнцыі развіцця грамадства Расійскай імперыі, а з другога – адзначалася шэрагам рэгіянальных асаблівасцей. Нягледзячы на працэсы ўніфікацыі і кадыфікацыі заканадаўства Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX ст., рэгуляванне правоў і абавязкаў, а таксама прававых адносін мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў насіла больш складаны і неадназначны характар у параўнанні з агульнарасійскімі нормамі.

Асноўнай характарыстыкай сацыяльнага статусу асобы ў канцы XVIII–XIX ст. у Расійскай імперыі з'яўлялася саслоўная прыналежнасць, якая рэгулявала кола правоў і абавязкаў, эканамічныя магчымасці, узаемаадносіны як у межах свайго сацыяльнага асяродку, так і па-за яго межамі, арыентавала на пэўныя каштоўнасці і стандарты паводзін. Разам з тым у беларуска-літоўскіх губернях прававы статус асобы ў межах асобнага саслоўя ці саслоўнай групы ў значнай ступені быў дэтэрмінаваны менавіта этнаканфесійнай прыналежнасцю.

Правамоцтвы мяшчан у розных галінах матэрыяльнага і працэсуальнага права адрозніваліся як у прадстаўнікоў хрысціянства і іўдаізму, так і розных канфесій хрысціянства. У межах урадавага курсу па пашырэнні расійскага ўплыву на акрэсленыя тэрыторыі найбольш шырокімі правамі былі надзелены праваслаўныя мяшчане, у сувязі з чым дадзеная катэгорыя мяшчан па сваіх правах і абавязках набліжалася да агульнарасійскіх нормаў. Пры гэтым правамоцтвы розных катэгорый мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў захоўвалі агульныя рысы ў прыватным праве па асабістых немаёмасных правах, у публічным − па крымінальнай і адміністратыўнай адказнасці, найбольшыя адрозненні вызначаліся ў прыватным праве па асабістых маёмасных правах, у публічным – па доступе да дзяржаўнай службы і грамадскага кіравання. Акрамя таго, прававы статус мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў характарызаваўся рэгіянальнай спецыфікай непасрэдна ў межах названых губерняў.

Адметныя асаблівасці прававога статусу мяшчан беларуска-літоўскіх губерняў, звязаныя з ахоўным курсам урадавай палітыкі і недаверам да насельніцтва «губерний, от Польши возвращенных», спецыфікай яго этнаканфесійнай структуры і іншымі аспектамі, па сутнасці, вызначылі існаванне ў межах дадзенай катэгорыі асобных сацыяльных груп, якія адрозніваліся па сваіх правамоцтвах і абавязках.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


[1] Гл.: Нольде А. Э. Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском. Вып. 1. Попытка кодификации литовско-польского права. СПб., 1906.

[2] Гл.: Полное собрание законов Российской империи (далее – ПСЗ РИ). Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1832. Т. 6, отд. 1. № 4233 ; ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб.,1841. Т. 15, отд. 1. № 13591.

[3] Гл.: Рубинштейн С. Ф. Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 г. / сост. С. Ф. Рубинштейн. Вильно, 1984 ; Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев, от Уложения царя Алексея Михайловича до настоящего времени, 1649–1873 гг. СПб., 1874.

[4] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1857. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 424.

[5] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб.,1851. Т. 25, отд. 1. № 24315.

[6] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1899. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 561–562.

[7] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1857. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 432–434, 488, 489, 491, 492.

[8] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1857. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 604.

[9] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 1 : в 45 т. СПб.,1830. Т. 28. № 21547.

[10] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб.,1845. Т. 19, отд. 1. № 18546.

[11] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1899. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 602.

[12] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 1 : в 45 т. СПб.,1830. Т. 20. № 14275. Ст. 47 ; ПСЗ РИ. Собр. 1 : в 45 т. СПб.,1830. Т. 22. № 16187. Ст. 10, 80−91.

[13] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 1 : в 45 т. СПб.,1830. Т. 39. № 30115 ; ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб.,1866. Т. 38, отд. 2. № 39118; ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб.,1866. Т. 40, отд. 1. № 41779 ; Сборник действующих узаконений о праве евреев на жительство и производство торговли в Российской империи, с сенаторскими и министерскими разъяснениями / сост. И. И. Арефа. СПб.,1897.

[14] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 1 : в 45 т. СПб.,1830. Т. 26. № 20075.

[15] Гл.: Свод законов Российской империи. Пг., 1914. Т. 10. Ч. 1 : Свод законов гражданских. Ст. 515, 560, 1387.

[16] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1857. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 523.

[17] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 3 : в 33 т. СПб., 1887. Т. 5. № 3173.

[18] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 3 : в 33 т. СПб.,1889. Т. 7. № 4814.

[19] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 3 : в 33 т. СПб.,1890. Т. 8. № 5609.

[20] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1899. Т. 9 : Законы о состояниях. Ст. 780, 784.

[21] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 3 : в 33 т. СПб., 1886. Т. 2. № 834.

[22] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1890. Т. 15 : Устав о паспортах и беглых. Ст. 1, 4.

[23] Гл.: Сборник указов и постановлений Временного правительства. Пг., 1917. Т. 1. С. 71−72.

[24] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1857. Т. 3 : Уставы о службе гражданской. Ст. 4, 5 ; Свод уставов о службе гражданской. Т. 1. Устав о службе по определению от правительства / сост. А. Скоров и А. Полянский. М., 1895. Ст. 4−6.

[25] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 3 : в 33 т. СПб., 1909. Т. 26, отд. 1. № 28392 ; Свод законов Российской империи : в 5 кн. Кн. 1. Свод уставов о службе гражданской. Т. 3. Устав о службе по определению от правительства / сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг. Пг., 1912. Ст. 6, 7.

[26] Гл.: Городовое положение со всеми относящимися к нему узаконениями, судебными и правительственными разъяснениями / сост. пом. присяж. пов. М. И. Мыш. 6-е изд., испр. и доп. СПб., 1885. Ст. 16–17. Доп. узакон. № 46. Ст. 667–675 ; Городовое положение 11 июня 1892 года с относящимися к нему узаконениями, судебными и правительственными разъяснениями / сост. присяж. пов. М. И. Мыш. 2-е изд., испр. и доп. СПб., 1894. Ст. 24. Доп. узакон. № 2.

[27] Гл.: Свод законов Российской империи. СПб., 1857. Т. 5 : Уставы о податях, о пошлинах и о сборах с питей, с свеклосахарного производства и с табаку : Устав о податях. Ст. 241, 244, 281.

[28] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб.,1866. Т. 38, отд. 2. № 39119.

[29] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 3 : в 33 т. СПб., 1901. Т. 18, отд. 1. № 15601.

[30] Гл.: ПСЗ РИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1876. Т. 49, отд. 1. № 52982, 52983 ; Свод законов Российской империи. СПб., 1897. Т. 4 : Устав о воинской повинности. Ст. 1.

Паступіў у рэдакцыю 05.03.2014.

***Ксенія Сяргееўна Царашкова*** – аспірантка аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Навуковы кіраўнік – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. П. Касцюк.